✓ **7 красавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы прэзентавалі пераможцу ў намінацыі «Арт-кніга» LXI Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» – альбом **«ЛітАрт. Знакі беларускага алфавіта»**. Новы альбом, выпушчаны ў 2021 г. выдавецтвам «Беларусь», падрабязна знаёміць з творчасцю беларускіх графікаў, шрыфтавікоў і каліграфаў з мастацкага аб'яднання «ЛітАрт». Ён прысвечаны аднайменнаму аб'яднанню, якое існуе больш за 20 гадоў, і беларускаму шрыфтавому мастацтву, яго гісторыі і сучаснасці. Выданне ўключае ў сябе каля 200 знакавых фотаілюстрацый, якія ўражваюць шрыфтавымі і графічнымі кампазіцыямі. Сярод іх – графічныя серыі і шрыфтавыя плакаты П. Семчанкі, Г. Мацура, С. Саркісава, П. Татарнікава, Ю. Тарэева, У. Свентахоўскага, Р. Найдзена, К. Васюка, Д. Сурскага, «Азбуква» Т. Кулажэнка, шрыфт А. Савіча і А. Кошалева, арт-інсталяцыі А. Міхалевіча, К. Вашчанкі і шмат іншых аўтарскіх напрацовак.